Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 292 (361) ПЯТНІЦА 20 СНЕЖНЯ 1940 г.

Цана 10 капеек.

Усім арганізацыям ВКП(б)

Цэнтральны Камітэт партыі пастанавіў склікаць на 15 лютага 1941 года XVIII Усесаюзную канферэнцыю ВКП(б).

Парадак дня XVIII Усесаюзнай канференцыі:

1) Аб рабоце партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта.

2) Арганізацыйныя пытанні.

Нормы прадстаўвіцтва і парадак выбараў:

1. На падставе § 37 Статута партыі, кіравацца наступнымі нормамі прадстаўніцтва для выбараў дэлегатаў на XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю:

а) абласныя, краявыя, рэспубліканскія партыйныя арганізацыі, маючыя звыш 10.000 членаў партыі, пасылаюць аднаго дэлегата з рашаючым голасам на кожныя 10.000 членаў партыі;

б) абласныя, краявыя, рэспубліканскія партыйныя арганізацыі, маючыя менш 10.000 членаў партыі, пасылаюць аднаго дэлегата з рашаючым голасам.

2. Па РСФСР, Украінскай ССР і Беларускай ССР дэлегаты на XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю выбіраюцца ад абласцей, краёў і аўтаномных рэспублік на пленумах абкомаў і крайкомаў партыі, а па іншых саюзных рэспубліках—ад рэспублік на пленумах ЦК компартый.

3. У сувязі з тым, што галоўным пытаннем парадку дня канферэнцыі з'яўляецца пытанне аб рабоце партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта—прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам наступным гаркомам партыі, прадстаўляючым прамысловыя цэнтры:

1. Молатаўскаму Архангельскай обл.
2. Беларэцкаму Башкірскай АССР
3. Ішымбаеўскаму " "
4. Беластоцкаму Беларускай ССР
5. Віцебскаму " "
6. Гомельскаму " "
7. Магілеўскаму " "
8. Ліпецкаму Варонежскай обл.
9. Дзержынскаму Горкаўскай обл.
10. Балахнінскаму " "
11. Выксунскаму " "
12. Мурамскаму " "
13. Паўлаўскаму " "
14. Чыатурскаму Грузінскай ССР
15. Кутаіскаму " "
16. Батумскаму " "
17. Каўроўскаму Іванаўскай обл.
18. Владзімірскаму " "
19. Шуйскаму " "
20. Кінешэмскаму " "
21. Іркуцкаму Іркуцкай обл.
22. Чэрэмхаўскаму " "
23. Карагандзінскаму Казахскай ССР
24. Рыдэрскаму " "
25. Балхашскаму " "
26. Вышневалоцкаму Калінінскай обл.
27. Петразводскаму Карэла-Фінскай ССР
28. Віїпурскаму (Выбаргскаму) Карэла-Фінскай ССР
29. Фрунзенскаму Кіргізскай ССР
30. Кіраўскаму Кіраўскай обл.
31. Новарасійскаму Краснадарскага края
32. Армавірскаму " "
33. Краснаярскаму " "
34. Керчэнскаму Крымскай АССР
35. Севастопальскаму " "
36. Ульянаўскаму Куйбышэўскай обл.
37. Сызранскаму " "
38. Чапаеўскаму " "
39. Рыжскаму Латвійскай ССР
40. Лепайскаму " "
41. Волхаўскаму Ленінградскай обл.
42. Пскоўскаму " "
43. Ноўгарадскаму " "
44. Каунаскаму Літоўскай ССР
45. Вільнюскаму " "
46. Кішынёўскаму Малдаўскай ССР
47. Берэзнікоўскаму Молатаўскай обл.
48. Кізелаўскаму " "
49. Краснакамскаму " "
50. Лысьвенскаму " "
51. Салікамскаму " "
52. Чусаўскаму " "
53. Каломенскаму Маскоўскай обл.
54. Серпухоўскаму " "
55. Нагінскаму " "
56. Падольскаму " "
57. Арэхава-Зуеўскаму " "
58. Егор'еўскаму " "
59. Электрастальскаму " "
60. Клінскаму " "
61. Краснагорскаму " "
62. Кунцэўскаму " "
63. Мыцішчанскаму " "
64. Ухтомскаму " "
65. Хімкінскаму " "
66. Шчолкаўскаму " "
67. Мурманскаму Мурманскай обл.
68. Кемераўскаму Новасібірскай обл.
69. Пракоп'еўскаму " "
70. Сталінскаму " "
71. Ленінск-Кузнецкаму " "
72. Анжэра-Суджэнскаму Новасібірскай обл.
73. Томскаму " "
74. Тюменскаму Омскай обл.
75. Орджанікідзеградскаму Орлоўскай обл.
76. Бранскаму " "
77. Клінцаўскаму " "
78. Шахцінскаму Растоўскай обл.
79. Таганрогскаму " "
80. Новачэркаскаму " "
81. Вольскаму Саратаўскай обл.
82. Тагільскаму Свердлоўскай обл.
83. Краснауральскаму " "
84. Рэўдзінскаму " "
85. Сероўскаму " "
86. Ярцэўскаму Смаленскай обл.
87. Астраханскаму Сталінградскай обл.
88. Мічурынскаму Тамбоўскай обл.
89. Сталінабадскаму Таджыкскай ССР
90. Сталінагорскаму Тульскай обл.
91. Калужскаму " "
92. Ашхабадскаму Туркменскай ССР
93. Іжэўскаму Удмурцкай АССР
94. Самаркандскаму Узбекскай ССР
95. Сергоўскаму Варашылаўградскай обл.
96. Варашылаўскаму " "
97. Красналучскаму " "
98. Днепрадзержынскаму Днепрапетроўскай обл.
99. Крыварожскаму " "
100. Нікопальскаму " "
101. Мелітопальскаму Запарожскай обл.
102. Львоўскаму Львоўскай обл.
103. Нікалаеўскаму Нікалаеўскай обл.
104. Херсонскаму " "
105. Крэменчугскаму Палтаўскай обл.
106. Сумскаму Сумскай обл.
107. Макееўскаму Сталінскай обл.
108. Краматорскаму " "
109. Горлаўскаму " "
110. Арцёмаўскаму " "
111. Канстанцінаўскаму " "
112. Орджанікідзеўскаму " "
113. Марыупальскаму " "
114. Славянскаму " "
115. Чысцякоўскаму " "
116. Комсамольскаму Хабараўскага края
117. Магнітагорскаму Чэлябінскай обл.
118. Златаустаўскаму " "
119. Каменск-Уральскаму " "
120. Грозненскаму Чэчэна-Інгушскай АССР
121. Орскаму Чкалаўскай обл.
122. Талінскаму Эстонскай ССР
123. Нарвскаму " "
124. Кастромскаму Яраслаўскай обл.
125. Рыбінскаму " "

4. Прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам наступным вузлавым партарганізацыям на чыгуначным транспарце:

1. Батайскаму чыгункі імені Варашылава
2. Батракскаму чыгункі ім. Куйбышэва
3. Беластоцкаму Беластоцкай чыгункі
4. Бранскаму II Маск. Кіеўскай чыгункі
5. Вільнюскаму Літоўскай чыгункі
6. Владзівастоцкаму Прыморскай чыгункі
7. Вспольінскаму Яраслаўскай чыгункі
8. Гомельскаму Беларускай чыгункі
9. Горкі-Сартыровачнаму Горкаўскай чыгункі
10. Дэбальцава-Сартыровачнаму Паўночна-Данецкай чыгункі
11. Інскаму Томскай чыгункі
12. Кочэтаўскаму Ленінскай чыгункі
13. Красна-Ліманскаму Паўночна-Данецкай чыгункі
14. Ленінградскаму (Ленінград-Пасажырскі) Окцябрскай чыгункі
15. Львоўскаму Львоўскай чыгункі
16. Масква—Сартыровачнаму Ленінскай чыгункі
17. Ніжне-Днепроўскаму Сталінскай чыгункі
18. Аршанскаму Заходняй чыгункі
19. Оснавянскаму Паўднёвай чыгункі
20. Петразаводскаму Кіраўскай чыгункі
21. Петрапаўлаўскаму Омскай чыгункі
22. Рыжскаму Латвійскай чыгункі
23. Рузаеўскаму Пензенскай чыгункі
24. Свердлоўск-Сартыровачнаму чыгункі ім. Кагановіча
25. Талінскаму Эстонскай чыгункі
26. Тбіліскаму чыгункі імені Берыя
27. Тульскаму чыгункі імені Дзержынскага
28. Вузлавому Маск.-Данбаскай чыгункі
29. Чэлябінскаму Паўднёва-Уральскай чыгункі
30. Ясінавацкаму Паўднёва-Данецкай чыгункі

5. Прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам партарганізацыям наступных портаў марского флота:

1. Архангельскаму
2. Бакінскаму
3. Батумскаму
4. Владзівастоцкаму
5. Ленінградскаму
6. Лепайскаму
7. Марыупальскаму
8. Мурманскаму
9. Новарасійскаму
10. Одэскаму
11. Поцііскаму
12. Рыжскаму
13. Талінскаму.

6. Прадастаўляецца дадаткова па аднаму мандату з рашаючым голасам партарганізацыям наступных портаў рэчнага флота:

1. Архангельскаму
2. Астраханскаму
3. Горкаўскаму
4. Ізмаільскаму
5. Кіеўскаму
6. Краснаярскаму
7. Ленінградскаму
8. Молатаўскаму
9. Маскоўскаму
10. Новасібірскаму
11. Растоўскаму
12. Рыбінскаму
13. Сталінградскаму
14. Хабараўскаму

7. Выбары дэлегатаў ад гаркомаў партыі, вузлавых партарганізацый чыгуначнага транспарта і ад партарганізацый портаў марского і рэчнага флотаў праводзяцца на пленумах абкомаў, крайкомаў, ЦК компартый саюзных рэспублік.

8. Комуністы, якія састаяць у партыйных арганізацыях Чырвонай Арміі, Ваенна-Марского Флота і часцей НКВД, удзельнічаюць у выбарах дэлегатаў на XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю на пленумах абкомаў, крайкомаў, ЦК компартый саюзных рэспублік на агульных падставах, як частка агульнапартыйных арганізацый.

Сакратар ЦК ВКП(б) І. СТАЛІН.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Аб узнагароджанні Беларускага сельскагаспадарчага інстытута ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

У азнаменаванне 100-гадовага юбілея Беларускага сельскагаспадарчага інстытута і ўлічваючы яго заслугі ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў сельскай гаспадаркі, узнагародзіць Беларускі сельскагаспадарчы інстытут ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

17 снежня 1940 г.
Масква, Крэмль.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

аб узнагароджанні работнікаў Беларускага сельскагаспадарчага інстытута

У азнаменаванне стогадовага юбілея Беларускага сельскагаспадарчага інстытута, за заслугі ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў сельскай гаспадаркі ўзнагародзіць:

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

1. **Вейса** Ювеналія Аляксандравіча — акадэміка Беларускай Акадэміі навук, доктара тэхнічных навук, прафесара, загадчыка кафедрай механізацыі.
2. **Красікава** Інакенція Ільіча — прафесара, загадчыка кафедрай неарганічнай хіміі.

ОРДЭНАМ «ЗНАК ПОЧЕТА»

1. **Годнева** Ціхана Нікалаевіча — акадэміка Беларускай Акадэміі навук, доктара біялагічных навук, прафесара, загадчыка кафедрай фізіялогіі раслін.
2. **Каўцэвіча** Нікалая Нікалаевіча — прафесара, загадчыка кафедрай фізікі.
3. **Кедрава-Зіхман** Оскара Карлавіча — акадэміка Беларускай Акадэміі навук, працаваўшага раней у Беларускім сельскагаспадарчым інстытуце.
4. **Папова** Васілія Васільевіча — доктара тэхнічных навук, прафесара, загадчыка кафедрай геадэзіі.

МЕДАЛЛЮ «ЗА ТРУДОВОЕ ОТЛИЧИЕ»

1. **Гоманава** Егора Пятровіча — супрацоўніка інстытута.
2. **Захарава** Сяргея Сцяпанавіча —кандыдата сельскагаспадарчых навук, загадчыка кафедрай агульнага земляробства.
3. **Лапо** Аркадзія Іванавіча — кандыдата сельскагаспадарчых навук, члена-карэспандэнта Беларускай Акадэміі навук, дацэнта кафедры селекцыі.
4. **Нікалаева** Нікалая Фёдаравіча — прафесара, загадчыка кафедрай батанікі.
5. **Новікава** Дзям'яна Раманавіча — дырэктара бібліятэкі інстытута.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

17 снежня 1940 г.
Масква, Крэмль.

IX З'ЕЗД КП (б) ЛАТВІІ

РЫГА, 17 снежня. (ТАСС). Сёння днём у сталіцы Латвійскай ССР гор. Рыге адкрыўся IX з'езд комуністычнай партыі (большэвікоў) Латвіі.

З'езд сабраўся ў замку, узвышаючымся над шырокай Заходняй Дзвіной. У 1919 годзе, калі ў Латвіі была савецкая ўлада, у гэтым зале засядаў VI з'езд комуністычнай партыі Латвіі. І вось цяпер, праз два дзесяткі год, пад зводамі замка сабраліся тыя людзі, якія ўсе гэтыя годы мужна змагаліся і дабіваліся перамогі пролетарскай рэволюцыі.

Цяжкай была барацьба. І не ўсе, далёка не ўсе комуністы, хто быў у гэтым замку на VI з'ездзе партыі, дажылі да цяперашняга радаснага дня. Адзін з тых, хто быў тут у 1919 годзе, падыходзіць да стала прэзідыума. Гэта—першы сакратар ЦК КП(б) Латвіі тав. Калнберзіньш. Ён адкрывае з'езд. Першыя свае словы ён прысвячае мужным змагарам рэволюцыі, якія аддалі сваё жыццё за справу рабочага класа. Ён гаворыць аб тых, якія былі расстраляны катамі, замучаны ў ахранках і турмах. Дэлегаты з'езда ўзнімаюцца з сваіх месц і мінутай жалобнага маўчання шануюць памяць загінуўшых таварышоў.

Затым тав. Калнберзіньш гаворыць аб чалавеку, імя якога насіў у сэрцы кожны комуніст, імя якога ўзбадзёрвала ў барацьбе і клікала да перамогі, імя чалавека, з якім звязана цяперашняя канчатковая перамога рабочага класа Латвіі,—ён гаворыць аб Сталіне. У адзіным парыве ўстае ўвесь з'езд. Грыміць бурная авацыя, перарываемая прывітальнымі воклічамі ў чэсць вялікага і любімага правадыра, у чэсць мудрай партыі большэвікоў і яе штаба — Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), у чэсць вялікага Сталіна і яго саратнікаў.

IX з'езд комуністычнай партыі (большэвікоў) Латвіі аб'яўляецца адкрытым. Дэлегаты з'езда спяваюць «Інтэрнацыянал». Незвычайна велічна і ўрачыста гучыць пролетарскі гімн, які спяваюць у гэтым зале на латышскай і рускай мовах.

З'езд прыступае да выбараў прэзідыума, мандатнай і рэвізійнай камісій. За сталом прэзідыума з'езда займаюць месца: тт. Калнберзіньш, Спурэ, Яблонскі, Нейланд, Віліс, Лацыс, Фрыц Дэглаў, Дзеравянскі, камандуючы войскамі Прыбалтыйскай асобай ваеннай акругі генерал-палкоўнік Лакціонаў, тав. Плесум і іншыя.

Наступае прапанова выбраць пачотны прэзідыум з'езда. Састаў пачотнага прэзідыума прапаноўвае Ольга Аўгусце. З'езд выбірае таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Жданава, Хрушчова, Берыя, Шверніка і Дзімітрава. Пры ўпамінанні імені таварыша Сталіна ў зале зноў узнікае незмаўкаючая, захопленая авацыя ў чэсць правадыра. Не паспела сціхнуць авацыя ў чэсць пачотнага прэзідыума з'езда, як паступае прапанова паслаць прывітальную тэлеграму Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну. І з новай сілай у зале бушуе авацыя. Тэкст прывітання агалашае дэлегат тав. Нейланд.

Зацвярджаецца парадак дня: 1) справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта КП(б) Латвіі—дакладчык тав. Калнберзіньш, 2) выбары Цэнтральнага Камітэта КП(б)Л, 3) выбары рэвізійнай камісіі.

Слова для даклада прадастаўляецца тав. Калнберзіньш. Ён зрабіў палітычна насычаны, змястоўны даклад аб дзейнасці Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Латвіі. У першай частцы свайго даклада тав. Калнберзіньш даў глыбокі аналіз міжнароднаму становішчу СССР, затым перайшоў да пытанняў будаўніцтва соцыялістычнай Латвіі і работы комуністычнай партыі ў новых умовах.

Сёння ў спрэчках па справаздачнаму дакладу ЦК КП(б)Л выступілі дэлегаты тт. Віліс, Лацыс, Ліберт, Зандман, Якабсон, Архіпчыкаў, Шуба і Руткоўскі.

З вялікім уздымам і захапленнем з'езд прыняў прывітанне ў адрас таварыша Молатава і ЦК ВКП(б).

Сёння на вячэрнім пасяджэнні з'езд большэвікоў Латвіі віталі прадстаўнік рыжскага гарнізона Чырвонай Арміі падпалкоўнік тав. Гарбачоў, дэлегацыя працоўных Маскоўскага і Цэнтральнага раёнаў Рыгі, а таксама дэлегацыі піонераў і комсамольцаў.

З'езд атрымаў прывітальную тэлеграму ад комуністычнай партыі большэвікоў Эстоніі.

Заўтра з раніцы на з'ездзе будуць працягвацца спрэчкі па справаздачнаму дакладу ЦК КП(б)Л.

(«Правда»).

Фабрыка № 29 выканала гадавы план

У выніку шырока разгарнуўшагася соцыялістычнага спаборніцтва калектыў фабрыкі № 29 17 снежня датэрмінова выканаў гадавую вытворчую праграму. План выпуску пражы ў кілограмах выканан на 101,2 проц. па ткацтву (у метрах) — 100,1 проц.

Калектыў фабрыкі ўзяў на сябе абавязацельства да канца года даць краіне звыш плана 35 тысяч метраў высокаякаснага сураўя.

Дырэктар фабрыкі **Конанаў**,
Галоўны інжынер **Рабоштан**,
Сакратар партарганізацыі **Стрыкаў**,
Старшыня фабкома **Развадоўская**.

УРУЧЭННЕ ПАСВЕДЧАННЯЎ ДЭПУТАТАМ

Акруговая выбарчая камісія 96-й акругі па выбарах у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных выдала пасведчанне Аляксею Васільевічу Лашуку аб выбранні яго дэпутатам Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Пасведчанні ўручаны камісіямі 164-й выбарчай акругі Дзержынскаму Антону Іванавічу, 97-й выбарчай акругі Данілюку Андрэю Майсеевічу, 96-й выбарчай акругі — Лягонскаму Казіміру Рамуальдавічу, 111-й выбарчай акругі—тав. Рашко, 112-й—тав. Пшыбыляку і іншым.

Творы класікаў марксізма на малдаўскай мове

КІШЫНЁЎ. Дзяржаўнае выдавецтва Малдавіі выпускае рад твораў Маркса, Леніна і Сталіна на малдаўскай мове. Вышлі з друку брашуры «Наёмная праца і капітал» К. Маркса, «Задачы саюзаў моладзі»—прамова В. І. Леніна на трэцім Усерасійскім з'ездзе Расійскага Комуністычнага Саюза Моладзі.

У бліжэйшыя дні 20-тысячным тыражом будуць выпушчаны брашуры В. І. Леніна «Аб ашуканстве народа лозунгамі свабоды і роўнасці», «Даклад аб рэволюцыі 1905 года».

Упершыню пераводзіцца на малдаўскую мову кніга І. В. Сталіна «Пытанні ленінізма».

За партыю родную

12 гадзін ночы. Вялікі і радасны дзень закончан. Зачыніліся дзверы на выбарчых участках. Камісіі ўсіх выбарчых участкаў Беластока прыступілі да падліку галасоў. Усхвалявана, пры ўрачыстым маўчанні членаў камісіі, старшыня зрывае пячатку з урны і беражна, як самую вялікую каштоўнасць, выкладвае на чырвоны абрус стала бюлетэні.

Вось яны, рознакаляровыя лісткі. Кожны—воля свабоднага чалавека, грамадзяніна краіны соцыялізма.

Народ галасаваў за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Большасць участковых камісій зарэгістрыравалі ў пратаколах 100-процантны ўдзел выбаршчыкаў у галасаванні і амаль 100-процантную падачу галасоў за вылучаных кандыдатаў.

На многіх бюлетэнях надпісы на беларускай, польскай, рускай і яўрэйскай мовах. Колькі душэўнай цеплыні, гарачых пачуццяў да радзімы, да большэвіцкай партыі, да вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна ў гэтых кароткіх радках!

«З радасцю аддаю свой голас за сталінскі блок комуністаў і беспартыйных».

Асабліва многа надпісаў у чэсць комуністычнай партыі і таварыша Сталіна: «Няхай жыве комуністычная партыя большэвікоў». «Няхай жыве таварыш Сталін».

Некаторыя выбаршчыкі звяртаюцца з цёплымі словамі да дэпутатаў: «Таварышы! Жадаю вам усяго добрага, працуйце на дабро народа».

«Я галасую за Яніну таму, што яна падыходзіць да работы ў органах совецкай улады. Яна будзе рабіць тое, што ёй скажа народ».

Якісьці паэт-імправізатар напісаў на сваім бюлетэні:

«За единство народов,
За Сталина,
За родину свободную,
За советской жизни строй,
За партию родную
Отдаю я голос свой».

А. Бярозна.

У дапамогу агітатарам

Паходжанне і класавая сутнасць каляд

Хрысціянская рэлігія заклікае вераваць у бога і яго сына Ісуса Хрыста, які нібыта з'явіцца збавіцелем ад усіх гаротнасцей прыгнятаемага чалавецтва. Хрысціянская вера будуецца на богу-чалавеку Ісусе Хрысце. Надыйдзі к папу або ксяндзу, скажы, што цяжка, у яго будзе адзін адказ:

— Раб божы Хрыстос цярпеў і нам вялеў. Хто церпіць да канца, той выратуецца.

І цярпелі працоўныя. Чаму? Таму, што казка аб богу, аб Хрысце перашкаджала бачыць і ведаць праўду, таму што чалавека з дзяцінства прывучалі верыць ў бажаство.

Але былі і ёсць людзі, якія смела заяўлялі аб хлусні рэлігіі, выкрывалі яе класавую сутнасць, будзілі думку людзей і на аснове ведання законаў развіцця прыроды навукова аб'яснялі свет. Такімі з'явіліся — Карл Маркс, Фрыдрых Энгельс, В. І. Ленін і І. В. Сталін.

Навука знімае з вачэй веруючых пелену, дапамагае бачыць усё ясна. Навукай дакладна даказана, што Хрыстос ніколі не існаваў, што біблейская байка аб цудоўным яго нараджэнні ад дзевы Марыі, смерці і васкрасенні з'яўляецца выдумкай. Гісторыя даказвае, што задоўга да часу, да якога хрысціянская рэлігія адносіць нараджэнне Хрыста, існавалі розныя сказанні аб цудоўным нараджэнні багоў, іх смерці і васкрасенні. Так, напрыклад, у старажытнаегіпецкай рэлігіі, якая ішла ўпераддзе хрысціянскай, існаваў «нябесны збавіцель» Озірыс.

Вельмі распаўсюджаным у Рымскай імперыі быў культ персідскага бога-збавіцеля Мітры. Аб ім захаваўся такі міф:

Мітра—сын дзеўственай багіні зямлі, нарадзіўся ў пяшчэры, на паклон да яго з падарункамі з'явіліся пастухі. За час свайго жыцця рабіў цуды: умяртвіў цудоўнага дзікага быка, з мазгоў якога потым выраслі расліны, з крыві—вінаград і з насення—хатняя жывёла. Мітра лічыўся збавіцелем свету. Ад яго чакалі, што ён перамажа злога духа Арымана, які ненавідзіць чалавецтва і робіць зло, пасылаючы засуху, патоп, усёспепяляючы агонь і зацвердзіць тысячагадовае царства свету...

Увогуле, сказанняў аб розных бажаствах многа.

Адкуль і на якім грунце з'явіліся гэтыя бажаственныя міфы—неіснуючыя людзі-богі?

На першых ступенях развіцця чалавечага грамадства, калі яшчэ не існавалі класы і не было сучасных сродкаў вытворчасці, чалавек быў бяссільным перад прыродай, і гэтае бяссілле дзікара ў барацьбе з прыродай нарадзіла веру ў багоў, у духі, у звышнатуральныя нябесныя сілы.

З развіццём чалавечага грамадства, узнікненнем класаў, з'яўленнем прыгнечаемых і прыгнятальнікаў або рабоў і рабаўладальнікаў роспач прыгнечаных, безвыходнасць іх становішча прыводзілі да пошукаў выратавання па-за зямным светам ад цудоўных сіл неба.

Ф. Энгельс, характарызуючы эпоху ўзнікнення хрысціянства, у сваёй рабоце «Бруно Бауэр і ранняе хрысціянства» піша:

«Ва ўсіх класах павінна была быць вядомая колькасць асоб, якія, страціўшы ўпаўненасць у матэрыяльным вызваленні, шукалі ўзамен яго вызвалення духоўнага, уцяшэння свядомасці, якое выратавала-б іх ад роспачы... Уцяшэнне павінна было выступіць іменна ў рэлігійнай форме, як і ўсё тое, што павінна было захапляць масы,—так гэта было ў тую эпоху».

Рымскае права было самым гнусным у свеце і разбурала нацыянальныя мэты. Рушылася, падала і старая нацыянальная рэлігія са сваімі нацыянальнымі багамі. У гэты час гісторыя ведае рад шырокіх паўстанняў рабоў, як напрыклад, паўстанне пад кіраўніцтвам Спартака і іншыя.

«Дзесяткі і сотні раз спрабавалі працоўныя на працягу стагоддзяў скінуць з плеч прыгнятальнікаў і стаць гаспадарамі свайго становішча.

Але кожны раз разбітыя і зганьбаваныя, вымушаны былі яны адступіць, захоўваючы ў душы скаргі і знявагі, злобу і роспач і накіроўваць погляды на невядомае неба, дзе яны спадзяваліся знайсці збаўленне». (Сталін).

К моманту зараджання хрысціянства адбываўся распад рабаўладальніцкай сістэмы гаспадаркі, але прыгнечанне і безвыходнасць рабоў заставалася ранейшай. Сацыяльная прыдаўленасць працоўных мас, поўная бездапаможнасць перад сляпымі сіламі капіталізма, які прыцыняе штодзённа ў тысячу разоў больш самых жудасных пакут самых дзікіх мучэнняў радавым рабочым людзям, чым усякія з рада вон выходзячыя падзеі накшталт войнаў, землятрасенняў і т. д.,—вось у чым самы глыбокі сучасны корань рэлігіі. «Страх стварыў багоў». (Ленін, «Аб адносінах рабочай партыі да рэлігіі»). Такія сацыяльныя карэнні рэлігіі.

Распад Рымскай імперыі, якая была цалкам аснавана на рабстве і патрасалася ўдарамі вялікіх паўстанняў рабоў, паражэнні гэтых паўстанняў былі глебай, на якой узнікла хрысціянская рэлігія, запазычваўшая ад папярэднічаўшай ёй рэлігіі бажэственыя сказанні, якія яна перапрацавала ў адпаведнасці з настроямі новага часу.

Заснавальнікі і прапаведнікі хрысціянства распаўсюджвалі вучэнне аб тым, што зямное жыццё нічога не варта, што ўзнагароды за пакуты трэба чакаць на небе, а на зямлі цярпець.

Рэлігія заклікала да адмаўлення ад барацьбы працоўных за сваё вызваленне ад прыгнечання. Яна настаўляла не змагацца за сваё існаванне на зямлі, а рыхтавацца да нябеснага жыцця. Гэтым хрысціянская рэлігія абяззбройвала эксплаатуемых, ставіла іх на калені перад эксплаататарамі. Усё гэта прыкрывалася бібліяй, у якой гаворыцца:

«Не супраціўляйся злому, а хто ўдарыць цябе ў правую шчаку, падставь да яго і другую».

«Кожны заставайся ў тым званні, у якім закліканы. Ці рабом прызван—не саромся».

Такое вучэнне як нельга лепш адпавядала інтарэсам правячых класаў, тым больш, што, не гледзячы на знешнія перамогі, Рымская імперыя не магла ліквідаваць глыбокага ўнутранага крызіса.

Цэзар правіцелі Рымскай імперыі пачынаюць аддаваць перавагу хрысціянскай рэлігіі супроць былога агульнапрызнанага культа бога Мітры, нараджэнне якога святкавалася 25 снежня (дзень зімняга сонцастаяння і пераходу ад зімовых работ да вясенніх). Свята гэта па рымскаму календару 3-га стагоддзя было раней да хрысціянства агульнадзяржаўным.

Першы рымскі імператар Канстанцін І, а за ім і наступныя заключаюць саюз з заправіламі хрысціянскай царквы і робяць яе часткай свайго адміністрацыйнага апарата. Хрысціянская царква ў сваю чаргу вядзе барацьбу з усімі другімі языческімі вераваннямі, культамі і абрадамі.

Рымскія імператары ў гэтым аказваюць хрысціянскай царкве прамую дапамогу. Канстанцін І закрывае языческія храмы. Гэтая мера ўсё-ж не дасягае таго, каб поўнасцю выкараніць раней існаваўшыя абрады. І хрысціянская рэлігія, пекаблі відазмяняючы іх, робіць іх сваімі абрадамі.

Хрысціянская царква ў пачатку святкавала каляды не 25 снежня, а 6 студзеня. Захад і Ухад таксама, як і Рым, па культу Мітры спраўлялі свята каляд 25 студзеня. Гэта пастрабавала ад хрысціянскай рэлігіі прыстасавання. У чацвертым стагоддзі ў царкоўна-папоўскім календары хрысціянскай царквы з'явілася свята каляд. Упершыню яно святкавалася ў 354 годзе. З гэтага часу вядзецца і летазлічэнне ад «Рождества Христова».

Як-жа гэта «Рождество Христово» малюе хрысціянская царква?

З дакументаў на гэты конт у папоў існуе толькі біблія і ў ёй чатыры евангеліі. Евангелістамі з'яўляюцца быццам Матвей, Лука, Марк і Іоан. Апошнія два аб нараджэнні Хрыста не ўпамінаюць ні слова. Першыя два былі быццам вучнямі Хрыста і відавочцамі ўсяго таго, што адбывалася. Пры гэтым хрысціянская царква сцвярджае, што біблія—кніга «боганатхнёная», а раз так, то трэба меркаваць, што ў ёй усё, а ў асаблівасці радаслоўная і біяграфічныя даныя Хрыста дакладныя і без хітрыкаў.

Паглядзім, як гэта выглядае на справе.

Матвей сцвярджае, што Іосіф і дзева Марыя пражывалі ў Віфлееме. Лука супярэчыць: нічога падобнага! — не ў Віфлееме, а ў Назарэце. Далей. Матвей гаворыць, што Хрыстос нарадзіўся ў апошнія годы праўлення іудзейскага цара Ірада, а Лука супярэчыць. Па яго, нараджэнне Хрыста адносіцца да часу ўсеагульнага перапісу насельніцтва ў Палестыне, якую праводзіў рымскі чыноўнік Квірыній. Але гісторыя ведае дакладна, што такі перапіс, па-першае, не праводзіўся, а па-другое, Квірыній з'явіўся, як дзяржаўная асоба, праз 10 год пасля смерці Ірада.

Матвей піша, што цар Ірад хацеў забіць Хрыста. Цікава, як гэта памёршы мог хацець забіць жывога? Матвей гаворыць, што каб пазбегнуць небяспекі быць забітымі, Іосіф, Марыя, а з імі і Хрыстос бягуць у Егіпет. Лука зноў ідзе наперакор і сцвярджае, што нікуды яны не беглі, а мірна сядзелі на адным і тым-жа месцы.

Але ўсё гэта нішто ў параўнанні з тым, што атрымліваецца з радаслоўнай. Паводле Матвея, ад Аўраама да Ісуса—42 пакаленні. Лука аспрэчвае гэта, не згодзен, і па яго падліку пакаленняў у Ісуса — 56. Дзедам Ісуса, паводле Матвея, з'яўлялася Якаў, а па Луку — Ілья. Прадкі ніяк не сходзяцца.

Вось якая «боганатхнёнасць» біблії і яе дакладнасць!

Супярэчнасцей у біблії, наогул, выключна многа. Тлумачыцца гэта тым, што евангеліі не даставерны, іх недаставерны і асобы іх пісаўшыя.

Характэрна, што нават французскі поп Ларыо ў сваёй кнізе «Аўтарытэт евангелія» піша: «Яны з'яўляюцца сказачнымі копіямі згубленых рукапісаў, складзеных невядома калі, дзе, невядомымі аўтарамі, якія супярэчаць адзін другому і якія ніколі не былі сведкамі таго, аб чым яны апавядаюць». Вядомы бацька царквы Аўгусцін заявіў: «Я-б не паверыў евангелію, калі-б мяне не абавязаў да гэтага аўтарытэт каталіцкай царквы».

Нарэшце, адзін з рымскіх пап, прымаючы багатыя дары ў вялікдзень, сказаў свайму прыбліжонаму: «Глядзі-ка, брат, а байка-ж аб Ісусе Хрысце—рэч даходная!».

Аб існаванні такой асобы, як папоўскі Хрыстос, павінны былі-б застацца сляды ў дакументах гісторыі. У тыя годы, да якіх евангелісты адносяць нараджэнне, дзейнасць і смерць Хрыста, а таксама яго васкрасенне, жылі такія вядомыя гісторыкі, як Плутарх і Светоній, паэты Персей, Лукан, Марцыял, Ювенал, яўрэйскія пісьменнікі і гісторыкі Філон, Іосіф Флавій, Юс і іншыя. І ніхто з іх ніводным радком не ўпамінае аб Хрысце. Гэтымі гісторыкамі адлюстравана дзейнасць нават дробных асоб таго часу і, відавочна, што такую буйную фігуру, якой з'яўляецца біблейскі Хрыстос, яны не прыкмеціць не маглі-б.

Гэта з'яўляецца ярчэйшым доказам выдумкі хрысціянскай царквы асобы Хрыста.

Бязглуздай казкай аб Хрысце дзесяткі стагоддзяў папы і ксяндзы трымалі і трымаюць людзей у кабале ў эксплаататараў.

Такое паходжанне і класавая сутнасць байкі аб нараджэнні Хрыста і калядах.

А. Аляксееў.



У Доме партыйнай асветы Мінскага гаркома КП(б)Б.
На здымку: на лекцыі аб міжнародным становішчы.
Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.

15 снежня на 1-м выбарчым участку горада Беластока.



Выбаршчыца т. Капяк Л. М. выходзіць з кабіны да выбарчай урны.
Фота А. Сапіра.

Што дапісвалі выбаршчыкі ў бюлетэнях

З вялікай радасцю аддавалі свае галасы працоўныя горада Беластока за лепшых людзей, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў. Сумесна з бюлетэнямі яны апускалі запіскі, у якіх выражалі сваю ўдзячнасць і аддаласць савецкай краіне за шчаслівае і радаснае жыццё.

На 4-м выбарчым участку Ленінскай выбарчай акругі сумесна з бюлетэнямі была апушчана запіска з вершамі наступнага зместу:

«Люблю свою родину—ласковую мать,
Готов за нее свои силы отдать.
Люблю свой чудесный могучий народ,
Который культуру себе создает.
За свободу спасибо Вам, Сталин, отец,
Конституции нашей великий творец.
Ты—знамя свободы и символ побед,
Подарю я тебе самый лучший букет.
Голосую за счастье и светлые годы,
Голосую за Вас, дорогие народы,
За отца, за детей, за любимую мать...»

Адзін з выбаршчыкаў 5-га выбарчага ўчастка на бюлетэні напісаў: «Галасую за савецкую ўладу. Я радасна жыву і задаволен савецкай уладай. Няхай жыве і мацнее наша радзіма. Калі надыйдзе час душыць ворагаў і я буду патрэбен, не гледзячы на мае 71 год, я пайду дапамагаць радзіме».

На выбарчым участку № 37, дзе балатыраваўся тав. Зайдэль, у бюлетэні напісана: «Галасуючы за цябе, т. Зайдэль, я галасую за таварыша Сталіна, за шчаслівае і раднае жыццё».

У запісцы, якая была знойдзена ў выбарчай урне 22-га выбарчага ўчастка, напісана: «Толькі савецкія выбары з'яўляюцца самымі сапраўднымі і дэмакратычнымі выбарамі».

Выбаршчык 175-й акругі на адвароце бюлетэня напісаў: «З часцю аддаю свой голас за сталінскі блок комуністаў і беспартыйных».

Думкі і пачуцці выбаршчыкаў

Раніца выдалася марозная. Яшчэ цёмна, а на вуліцах незвычайнае ажыўленне. Ва ўсіх напрамках ідуць людзі і паасобку і цэлымі групамі. Сцякаюцца яны да вызначаных пунктаў, спяшаючыся аддаць свае галасы адзін другога. Настрой ва ўсіх прыўзняты, святочны.

Яны ідуць на выбарчыя ўчасткі галасаваць за сваіх кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў.

Вось выбарчы ўчастак № 62 (Першамайская выбарчая акруга) па Чапаеўскай вуліцы.

Уваходзіць 54-гадовы настаўнік Левін. Яго ветліва сустракаюць члены ўчастковай камісіі. Левін азіраецца. Залы выбарчага ўчастка любоўна ўпрыгожаны, дэкараваны. Усё тут вабіць вока: вакол каўры, партрэты, лозунгі, кветкі. Цёпла, светла. Ва ўсім узорны парадак. Гэта рэзультат вялікай працы, укладзенай у арганізацыю ўчастка старшынёй участковай выбарчай камісіі — парторгам упраўлення Беластоцкай чыгункі тав. Кожухавым і энтузіястамі камісіі Казначэевай, Сільвестравай, Віленскай, Янойскай, Салаўёвым і асабліва таварышам Банікавым.

Настаўнік Левін атрымлівае бюлетэнь. Але што з Левіным? Чаму ў яго трасуцца рукі? У зале-ж цёпла. Вось ён апускае бюлетэнь—зноў трасуцца рукі. Адышоў ад урны і просіць у старшыні ўчастковай камісіі папяросу. Выкурыўшы, папрасіў другую... У чалавека якіясьці перажыванні. Але ў чым справа? Чым выклікана хваляванне?

На выбарчым участку абстаноўка такая, што нішто не павінна хваляваць выбаршчыка. А можа быць усё-ж што-небудзь незаўважанае ёсць? Ды не! Аб гэтым Левін не гаворыць ні словамі, ні жэстамі. Ён сеў. Просіць даць яму паперы і аловак.

Некалькі мінут ён піша, а затым перадае паперу члену участковай камісіі. Радкоў там няшмат, але яны значныя. Мы чытаем: «Прышоў на выбарчы ўчастак з поўным усведамленнем адказнасці. У мяне наступіў рашучы і апошні зрух у бок выпраўлення сацыяльных дэфектаў». Далей ён піша аб тым захапленні, якое зрабіў на яго выбарчы ўчастак. Але гэта не галоўнае. Галоўнае ў тым, што ён, выбаршчык, настаўнік-інтэлігент, перажыў у сваёй свядомасці мінулае, супаставіўшы з ім сучаснае, прышоў да выпраўлення сваіх «сацыяльных дэфектаў».

Седзячы ў пакоі адпачынку выбарчага ўчастка, Левін дзеліцца з даверанным тав. Абразанавым сваімі ўражаннямі.

— Вось была Польшча панская. Працаваў я ў школе, але зволілі. Да савецкай улады быў беспрацоўным. А зараз? Зараз — дабро пажалаваць на старасці год у школу. Вось ён, час! Гэта рэзультат клопатаў савецкай улады. Як прыемна адчуваць сябе роўнапраўным чалавекам — гаспадаром! Ну, як тут не хвалявацца? Ад душы, ад усяе душы, чыстасардэчна я пішу свой водгук і свае пажаданні, каб мэты, якія пастаўлены перад дэпутатамі ў Советы, былі ажыццёўлены на ўсе 100 процантаў.

З выбарчага ўчастка 54-гадовы настаўнік Левін пайшоў праз паўтары гадзіны.

Разам з дарослымі на выбарчым участку пабывалі дзеці. І для кожнага з іх былі падрыхтаваны—каму ёлка, каму—цацкі, а каму—хто на нагах яшчэ не стаіць—чысценькі ложак. Маці галасавалі спакойна.

Ці было што-небудзь падобнае ў панскай Польшчы? На гэта пытанне адказваюць самі выбаршчыкі. Вось адзін запіс у кнізе ўражанняў: «Мне 35 год. Пры панскай Польшчы я галасавала не адзін раз. Але нічога падобнага я ў сваім жыцці не бачыла».

Група членаў арцелі «Шлях сацыялізма», якія прыехалі ў Беласток з Брэста і тут галасавалі, зрабілі такі запіс: «Тут усё такое-ж роднае і блізкае, як і дома. Так і б'е ключом шчаслівае творчае жыццё, так і хочацца выразіць ад усёй душы сардэчнае дзякуй таму, хто наладзіў такое цудоўнае жыццё. А гэта ўсё дзякуючы мудрай палітыцы таварыша Сталіна».

Хвалюючы і радуюць радкі, напісаныя рукой Д. Вільямовіч. «Прагаласавала я, адышла і думаю: што-ж гэта такое? Няўжо ў былой Польшчы галасавалі мы, за каго жадалі? Няўжо мы ведалі, што такое правільнае галасаванне? Не! А зараз я галасавала з радасцю. Галасавала за лепшых сваіх сыноў і дочак. Я вельмі добра, што выбраннікі нашы будуць клапаціцца аб нас».

А вось аб чым гаварылі сваімі запісамі дзеці. Хлопчык Пецця Асінскі: «Мае бацькі пайшлі на выбары ў 6 гадзін раніцы. Я адзін астаўся дома: не ўзялі мяне. Прачнуўся—няма нікога. Устаў, апрануўся і пайшоў на выбарчы ўчастак. Там было весела. Для дзяцей была наладжана ёлка. Былі розныя цацкі. Я дзякую нашаму любімаму таварышу Сталіну. Дзякую таварышу Сталіну за наша шчаслівае дзяцінства».

Вучань Лейба Агурэк разам з бацькамі пабываў на выбарчым участку. У кнізе ўражанняў ён запісаў: «Усе дзеці жыць па-новаму хочуць. Ваня будзе трактарыстам, Бора—машыністам, а Сярожа — інжынерам. Усе мы будзем будаваць фабрыкі. Вось зачым мы шагаем у школу».

Выбаршчыца Якавец зрабіла такі запіс: «Мы ўсе, савецкія грамадзяне, акружаны сталінскімі клопатамі».

Такімі былі мыслі і пачуцці выбаршчыкаў у вялікі дзень 15 снежня, калі яны галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

І. А.

У што абыходзіцца імперыялістычная вайна

Вылічыць дакладна, колькі пажырае цяперашняя імперыялістычная вайна, пакуль яшчэ немагчыма. Аднак ужо зараз ясна, што выдаткі на вайну будуць намнога больш чым у годы першай імперыялістычнай вайны.

Раней усяго трэба ўлічыць, што многія капіталістычныя дзяржавы затрачвалі на працягу раду год велізарныя сродкі на падрыхтоўку да вайны. Так, напрыклад, у Францыі штогодна адпускаліся мільярдныя крэдыты на пабудову «лініі Мажыно».

Вайна апракінула бюджэтныя выкладкі. У першую палову бягучага года ўсе выдаткі Англіі склалі 1 мільярд 610 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў супроць 562 мільёнаў фунтаў за той-жа перыяд мінулага года (1 фунт стэрлінгаў = 21 руб. 40 кап.). Каля 80 процантаў гэтых выдаткаў ідзе на ваенныя мэты. Англійскія эканамісты мяркуюць, што агульная сума выдаткаў Англіі ў 1940 — 1941 фінансавым годзе складзе велізарную лічбу—каля 3,5 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў.

Па словах былога французскага міністра ўзбраенняў Дотры, кожны дзень вайны абыходзіўся Францыі ў мільярд франкаў. Пасля заключэння перамір'я вайна ўсё яшчэ каштуе Францыі 400 мільёнаў франкаў у дзень (100 франкаў=11 руб. 13 кап.), якія яна абавязана выплачваць на ўтрыманне германскай акупацыйнай арміі. Такім чынам, да 1 кастрычніка гэтага года ваенныя выдаткі Францыі выразіліся ў суме не менш 336 мільярдаў франкаў. У гэтую суму не ўвайшла кашторнасць разбураных бамбардыроўкамі ваенных аб'ектаў, дамоў, прамысловых будынкаў, мастоў, чыгунак і т. д. У Францыі разбураны дзесяткі гарадоў, тэкстыльныя фабрыкі поўначы, металургічныя заводы, вінаградніі, загінула многа жывёлы.

Па афіцыяльных даных, ваенныя выдаткі Англіі, Францыі і Злучаных Штатаў Амерыкі ў 1940 годзе складаюць 36 мільярдаў долараў, іначай гаворачы, 100 мільёнаў долараў у дзень (1 долар = 5 руб. 30 кап.).

Германія, як піша берлінскі карэспандэнт амерыканскай газеты «Нью-Йорк пост», выдаткоўвае на ваенныя мэты штомесячна ў сярэднім 4,5 мільярды марак (100 марак=212 руб.).

З бюджэта Японіі 6 мільярдаў іен падаюць на ваенныя выдаткі (100 іен = 124 руб. 28 кап.).

Рэзкае павелічэнне ваенных выдаткаў пагдядаецца і ў малых нейтральных краінах, як Швецыя, Швейцарыя, Фінляндыя і іншыя.

Капіталісты ведаюць толькі адзін спосаб пакрыцця выдаткаў вайны: яны перакладаюць іх на плечы працоўных мас, яны драпежніцка выкарыстоўваюць народнае дабро. Сродкі для ваенных патрэб у капіталістычных краінах набываюцца шляхам павышэння падаткаў, выціскаў з заработнай платы рабочых і служачых, шляхам рэквізіцый жывёлы і хлеба ў сялян.

Уплыў вайны найбольш цяжка сказаўся на рабочым класе. Рабочыя падвяргаюцца нечуванай эксплаатацыі. У ваюючых краінах рабочы дзень паўсюдна падоўжан да 10 і 12 гадзін.

Не меншыя афяры прыходзіцца несці сялянству. У ваюючых краінах сяляне церпяць ад абавязковых паставак і ваенных рэквізіцый. Іх дамы ў ваеннай зоне нярэдка знішчаюцца.

Вайна разбурыла таксама сотні тысяч рамеснікаў. З-за мабілізацый у Парыжы, Лондане і іншых гарадах тысячам дробных гандляроў і рамеснікаў прышлося закрыць свае майстэрні і кінуць сем'і на волю лёсу.

Затое буйная буржуазія нечувана абагачаецца на вайне. Для горсткі банкіраў і магнатаў ваенная прамысловасці вайна — крыніца калассальных прыбыткаў. Напрыклад, 400 амерыканскіх фірм за першыя 6 месяцаў гэтага года атрымалі 649 мільёнаў долараў прыбыткаў супроць 409 мільёнаў долараў за адпаведны перыяд мінулага года.

Буржуазныя ўрады ўсяляк ідуць насустрач капіталістам. У Злучаных Штатах Амерыкі буржуазія вызвалена ад значнай часткі падаткаў.

Капіталісты атрымліваюць ад вайны незлічоныя прыбыткі. Народным-жа масам капіталістычных краін вайна нясе жабрацтва, разбурэнне, пакуты, голад і смерць.

Ф. Л.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Па-бальшэвіцку правадзіць партыйныя сходы

Вялікая роля ў жыцці партыі адведзена партыйным сходам. На партыйным сходзе комуністы абмяркоўваюць пытанні гаспадарчага і палітычнага жыцця, уносяць каштоўныя прапановы па паляпшэнню работы.

Партыйныя сходы — найбольш яркае выражэнне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. Вялікая роля належыць партсходу, як школе бальшэвіцкага выхавання партыйных кадраў. Але значэнне партыйнага схода будзе ажыццяўляцца поўнасцю толькі тады, калі кіраўнікі партыйных арганізацый будуць сур'ёзна да іх рыхтавацца і калі на саміх сходах будзе шырока разгорнута крытыка і самакрытыка.

Аднак факты гавораць, што некаторыя партыйныя кіраўнікі забываюць аб адказнасці за падрыхтоўку да партсхода.

У якасці прыклада можна прывесці партарганізацыі суда і пракуратуры. Тут на партыйным сходзе абмяркоўвалася пытанне аб падрыхтоўцы да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі і тут-жа на сходзе падымаецца хадайніцтва перад райкомам партыі аб вызваленні ад удзелу ў выбарчай кампаніі. Вось што напісана ў пратаколе партыйнага схода: «Мы, судовыя работнікі, павінны ўвайсці ў хадайніцтва перад райкомам партыі аб зняцці з нас нагрузкі — работы ў передвыбарчай кампаніі».

Раней чым высоўваць такую прапанову на партыйным сходзе, сакратар партыйнай арганізацыі, а таксама комуністы павінны былі добра падумаць аб тым, хто-ж будзе прымаць удзел у выбарчай кампаніі, хто-ж з'явіцца авангардам ва ўсіх праводзімых партыяй і ўрадам мерапрыемствах, калі не комуністы, хто акажа практычную дапамогу мясцоваму актыву?

У партарганізацыі пры ломжынскім аддзяленні Дзяржбанка дрэнна рыхтуюцца да партсходаў. Часта комуністы прыходзяць на сход непадрыхтаваныя, не ведаючы павесткі дня.

Пры падрыхтоўцы да правядзення партыйнага схода некаторыя сакратары партыйных арганізацый забываюць добра апавясціць комуністаў аб дні яго правядзення і павестцы дня. Недахопы ў падрыхтоўцы і правядзенні партыйных сходаў тлумачацца таксама тым, што райком партыі мала аказвае практычнай дапамогі пярвічным арганізацыям.

Скарыстоўваючы вопыт перадавых арганізацый, сакратары ўсіх пярвічных партыйных арганізацый павінны забяспечыць такую падрыхтоўку і правядзенне партсходаў, каб яны садзейнічалі паляпшэнню партыйна-палітычнай работы.

Ф. Балаева,
інструктар Ломжынскага райкома партыі.

Вучоба комсамольцаў

КНЫШЫН. **(Ад нашага карэспандэнта).** Стварэнне камісіі па прапагандзе і агітацыі пры райкоме комсамола дало магчымасць значна палепшыць кіраўніцтва вучобай комсамольцаў ва ўсіх пярвічных арганізацыях раёна. Камісія пастаянна займаецца пытаннямі выхавання моладзі ў духу бальшэвізма. На пасяджэнні камісіі распрацаван канкрэтны план разгортвання прапагандысцкай работы ў арганізацыях комсамола і сярод несаюзнай моладзі. Для выканання гэтай важнейшай работы прыцягнуты новыя людзі, лепшыя актывісты.

Камісію па прапагандзе і агітацыі ўзначальвае актывіст тав. Махамед, членамі камісіі з'яўляюцца настаўнік тав. Камароўскі, дырэктар школы тав. Бондар і іншыя. Усе яны добрыя прапагандысты і агітатары.

Многія комсамольцы па-сур'ёзнаму пачалі вывучаць гісторыю партыі і дабіліся ўжо вялікіх поспехаў. Комсамольцы тт. Панчанка і Грышкін поўнасцю закончылі вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Тав. Грышкін глыбока вывучае творы Леніна і Сталіна. Ён прачытаў выбраныя творы Герцэна, Чэрнышэўскага. Як добрага арганізатара моладзі і растучага комсамольца тав. Грышкіна прынялі кандыдатам у члены партыі.

Комсамолец тав. Селіванаў працуе памочнікам раённага пракурора. Ён глыбока вывучае юрыдычную літаратуру і працуе над вывучэннем гісторыі партыі. Па «Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)» ён працуе над восьмым раздзелам. Па кожнаму раздзелу тав. Селіванаў склаў канспект. Ён наведвае ўсе лекцыі, якія чытаюцца ў раёне ў дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю бальшэвізма. Паспяхова працуе над авалоданнем тэорыі марксізма-ленінізма новапрынятый ў комсамол тав. Бекер.

У некаторых пярвічных комсамольскіх арганізацыях створаны гурткі па вывучэнню гісторыі партыі. Гуртком у арганізацыі райвыканкома кіруе старшы аграном райза комсамолка тав. Барысенка, а на цагельным заводзе — тав. Міхалка. Заняткі ў гуртках наведваюць не толькі комсамольцы, але і многа несаюзнай моладзі. Усяго ў гуртках вучобай ахоплена 83 чалавекі.

У раённай комсамольскай арганізацыі палепшылася лекцыйная работа. З лекцыямі сістэматычна выступаюць маладыя лектары. За апошні час прачытана больш 20 лекцый, на якіх прысутнічала больш 500 чалавек моладзі. Цікавасць да лекцый вельмі вялікая. Старшыня камісіі па прапагандзе і агітацыі пры райкоме комсамола тав. Махамед для моладзі мястэчка Галёндз прачытаў лекцыю на тэму: «Ленін аб комуністычным выхаванні моладзі». Лепшы агітатар тав. Марціновіч з вялікім поспехам выступае перад моладдзю з лекцыямі на антырэлігійныя тэмы. Лекцыі і даклады чытаюць і іншыя комсамольцы.

В. Гарбанёў.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ВЫХОЎВАЕМ ПАТРЫЁТАЎ

Чырвоная Армія — выдатная школа для нашай совецкай моладзі. Яна абагачае юнакоў такімі благароднымі якасцямі, як цвёрдасць волі, высокае сазнанне доўгу перад радзімай і беззаветная гатоўнасць афяраваць усім у імя вялікай справы комунізма.

Дастойнасць і храбрасць, скромнасць і мужнасць — неад'емныя якасці нашага байца.

Усе гэтыя высокія якасці выхоўваюцца ва ўпорнай, штодзённай баявой і палітычнай вучобе. Камандзіры і палітработнікі, як вопытныя педагогі, усімі сіламі і сродкамі з першых-жа дзён прабывання байца ў часці куюць сапраўднага воіна краіны социялізма. Ад пад'ёму да адбою чырвонаармеец кожную мінуту выкарыстоўвае для павышэння ўзроўню сваіх спецыяльных і палітычных ведаў.

У агульнай сістэме выхаваўчай работы адно з важнейшых месц займае палітычна-масавая работа.

Я хачу расказаць, як гэта работа праводзіцца ў нашым падраздзяленні.

Дэтальна распрацаваны план палітвыхавання байцоў паставіў перад намі задачу: дапамагаць асабістаму саставу ў вывучэнні VII раздзела чырвонаармейскага палітпадручніка, у якім у сціслым відзе ізлагаецца гісторыя ВКП(б), выхоўваць байцоў у духу загадаў і ўказанняў наркома абароны СССР, маршала Совецкага Саюза тав. Цімашэнкі.

Для паспяховага ажыццяўлення практычных мерапрыемстваў, намечаных па плану, мы стварылі калектыў лектараў, агітатараў і кансультантаў. У калектыў уваходзяць палітработнікі, камандзіры і добра падрыхтаваныя чырвонаармейцы. Кожны член калектыва атрымліваў чоткае заданне. За лістапад праведзена 10 гутарак на розныя тэмы. Праведзена кансультацыя па кнігах Леніна «Што рабіць» і «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі». Намеснік палітрука тав. Кавалёў зрабіў даклад аб творы Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў». Тав. Несноў прачытаў лекцыю «Расія ў канцы XIX стагоддзя».

З вялікай цікавасцю чырвонаармейцы слухалі гутарку «Аб комуністычным выхаванні», аб «Палітыцы бальшэвікоў па пытаннях вайны, міру і рэволюцыі ў першай імперыялістычнай вайне».

У падраздзяленне прыбыла група маладых байцоў прызыву 1940 года. З імі выхаваўчая работа праводзіцца па асобай праграме.

У сістэме палітпадрыхтоўкі чырвонаармейцы другога года службы вывучаюць гісторыю ВКП(б) па асноўных яе этапах. З выключным упорствам і стараннем байцы вывучаюць мінулае нашай слаўнай бальшэвіцкай партыі, на яе традыцыях яны вучацца страсна ненавідзець ворагаў працоўных. Ітогавыя заняткі паказалі, што большасць засвоіла матэрыял на «добра» і «выдатна». Вынікам палітвыхаваўчай работы з'яўляецца рост выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Лепшыя выдатнікі занесены на дошку пачоту.

Вось былы камбайнер тав. Шулешоў. Ён за поўгода службы ў РСЧА грунтоўна авалодаў сваёй ваеннай спецыяльнасцю і адначасова вывучыў абавязкі другіх гарматных нумароў. У выпадку, калі ў баі выйдзе са строю хто-небудзь з яго таварышоў, Шулешоў неадкладна яго заменіць, і гармата будзе весці па праціўніку знішчальны агонь. Шулешоў скромны і культурны баец, служыць прыкладам для іншых.

Комсамолец Малаханаў таксама актывіст баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Чырвонаармеец Цімафееў за выдатныя паказчыкі вылучан камандзірам аддзялення. Большасць байцоў падраздзялення — комсамольцы, якія займаюць авангардную ролю ў вучобе.

Змяніліся людзі за год прабывання ў радах РСЧА. Гэта ўжо не сарамлівыя, нясмелыя юнакі, гэта поўнацэнныя байцы Чырвонай Арміі, упэўненыя ў сваіх сілах, гатовыя ўмела і з дастоінствам граміць любога ворага.

Палітрук **П. Чыкун.**



У Н-скай часці Заходняй асобай ваеннай акругі. Малодшы камандзір П. Ф. Сокіркін (злева) праводзіць з маладымі байцамі-курсантамі заняткі па вывучэнню артылерыйскіх прыбораў. Фотахроніка БЕЛТА.



Першая жаночая стаханаўская брыгада лесарубаў Гродненскага леспрамгаса на лесаўчастку Крынічная, арганізаваная стаханаўкай-лесарубам тав. Вайцюкевіч Э. С., выконвае норму на 190%.

На здымку: тав. Вайцюкевіч (другая справа) тлумачыць сваёй брыгадзе будову лучковай пілы. Фото А. Сапіра.

Больш увагі падрыхтоўцы механізатарскіх кадраў

За год з лішнім існавання совецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі сельская гаспадарка нашай вобласці атрымала вялікую колькасць трактароў і складаных сельскагаспадарчых машын. Створаныя машынна-трактарныя станцыі аказалі маладым калгасам велізарную дапамогу.

Машынны парк МТС павялічваецца. Гэта патрабуе падрыхтоўкі неабходнай колькасці кваліфікаваных кадраў трактарыстаў, механікаў, брыгадзіраў і т. д. Аднак многія кіраўнікі машынна-трактарных станцый і раённыя арганізацыі недаацэньваюць важнасці падрыхтоўкі механізатарскіх кадраў. У гэтым годзе было падрыхтавана 415 чалавек. У 1941 годзе неабходна падрыхтаваць у школах механізацыі сельскай гаспадаркі 242 чалавекі, у тым ліку трактарыстаў — 170, брыгадзіраў — 48, механікаў — 24.

Між тым дырэктары МТС да гэтага часу нічога не зрабілі, каб выканаць разнарадку аб пасылцы на курсы людзей. Камплектаванне школы праходзіць яўна нездавальняюча. У Валкавыскай школе трактарыстаў абучаецца 108 чалавек, у той час як павінна быць 170. У Рагачоўскую школу механікаў паслана 15 чалавек замест 24, у Крычаўскую школу брыгадзіраў—17 чалавек замест 24 і т. д. Усяго зараз на розных курсах абучаецца 145 чалавек замест 242 па плану. Тэрмін камплектавання школ механізацыі даўно прайшоў. Аднак і на сённяшні дзень райкомы партыі, раённыя зямельныя аддзелы, дырэктары машынна-трактарных станцый не выконваюць указанняў абкома партыі аб пасылцы людзей у школы механізацыі.

Асабліва дрэнна справа абстаіць у Едвабнаўскай МТС. Тут на курсы не паслалі ні аднаго чалавека. Монькаўская МТС павінна была падабраць і накіраваць 10 чалавек на курсы, паслана-ж толькі 5. Кольнаўская МТС паслала толькі 2-х чалавек, Лапская—3-х. Свіслацкая і Крынкаўская машынна-трактарныя станцыі не паслалі ні аднаго чалавека.

Ёсць усе ўмовы для таго, каб падрыхтаваць неабходную колькасць кваліфікаваных кадраў сельскай гаспадаркі. Неабходна толькі партыйным і совецкім арганізацыям, дырэктарам машынна-трактарных станцый па-сапраўднаму ўзяцца за гэту справу.

І. Гвяздовіч.

Што тармозіць рамонт трактараў?

ВАЛКАВЫСК. **(Ад нашага карэспандэнта).** Роскай машынна-трактарнай станцыі (Валкавыскі раён) патрэбна адрамантаваць 8 трактароў. Тры трактары павінны быць адрамантаваны капітальна, а 5 патрабуюць бягучага рамонту. Згодна плана ў чацвертым квартале гэтага года МТС павінна выпусціць з рамонту тры трактары. Заканчваецца квартал, а рамонтныя работы амаль не пачаты.

У чым-жа прычына? Перш за ўсё тут недапушчальна зацягнута будаўніцтва трактарнай майстэрні. Усе ўмовы для заканчэння будаўніцтва майстэрні былі. Аднак, будаўнічыя работы выкананы толькі на 80 проц.

Для рамонту вылучана 11 чалавек трактарыстаў. Гэтым людзям не створаны неабходныя ўмовы для работы. Трактарысты, якія працуюць на рамонце, жывуць у вельмі цесным і няўтульным памяшканні. Не арганізавана грамадскае харчаванне, графік рамонту не складзен. Соцыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзенне рамонту трактараў не разгорнута сярод рамонтных рабочых.

Кіраўнікі машынна-трактарнай станцыі замест таго, каб прыняць належныя меры для хутчэйшага правядзення рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын, займаюцца склокамі.

Д. Казлоў.

Мастакі і скульптары нашай вобласці

23 сакавіка 1940 года абласны аддзел мастацтваў адкрыў у Беластоку першую абласную выстаўку жывапісу, графікі і скульптуры. На выстаўцы была прадстаўлена і народная творчасць: тканіны, касцюмы, рысункі і карткі. Работы мастакоў-самавучак сведчылі аб іх значных здольнасцях, якія пры ранейшых умовах у панскай Польшчы не змаглі-б праявіцца. Клопаты аб мастаках-самавучках ужо сказаліся. Некаторыя з іх, як Краўчук і іншыя, атрымліваюць спецыяльную адукацыю.

На выстаўцы мастакі былі прадстаўлены эскізамі, выкананымі на тэмы: сустрэча Чырвонай Арміі, падзеі апошняга часу ў вёсках, на фабрыках і заводах. Карціны праглядаліся камісіяй пад старшынствам В. М. Сокалава. Гэта была падрыхтоўка да рэспубліканскай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР».

Пасля закрыцця выстаўкі былі адабраны лепшыя экспанаты і адпраўлены ў Маскву на дэкаду беларускага мастацтва.

Багацей за ўсё была прадстаўлена графіка. Таленавіты Юлій Краеўскі прадставіў рад работ. Яго тэматыка — соцыяльная. Ён піша пра ранейшую ўкраінскую вёску, паказвае яе штодзённыя патрэбы, яе пратэст супроць існаваўшых умоў жыцця. Краеўскі—майстар рысунка і кампазіцыі.

Арыгінальны Рафаэль Мандэльцвейг у сваіх рысунках пяром — каляровай тушшу на чорным картоне. Добрыя па кампазіцыі і рысунку яго «Агітатар у вёсцы» і «Падрыхтоўка лозунгаў».

На выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» Мандэльцвейг прадстаўлен пейзажам «Совецкая вуліца ў Беластоку» (масла).

Пакідаюць уражанне рысункі Кшэчаноўскага, асабліва яго «Старая з ружжом». У яе твары і руках столькі мэтанакіраванасці! Рашучасць байца ва ўсёй яе фігуры. Сцяг над домікам у далечыні паказвае, за што яна змагаецца, што ахоўвае.

Тав. Малярэвіч добра адчувае форму чалавечага цела. Мастак адлюстроўвае рэчаіснасць без прыкрас, але з уменнем перадаць чалавечае пачуццё. З жывапісных яе работ добры натурморт «Кветкі». Для выстаўкі тав. Малярэвіч прадставіла «Арышт польскіх памешчыкаў» (масла).

Таленавіты работы графіка тав. Тыбера. Спецыяльнай адукацыі ён яшчэ не атрымаў. Аб яго поспехах у гэтым напрамку сведчаць рысункі і афорты «Рабочы», «Стаханавец», «Жніво» і іншыя на выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР».

Прыгожы пейзажы Абрама Фрыдмана. Тонкім чуццём у вырашэнні прасторы ўладае малады графік А. Рапапорт. Аднак, у гэтага мастака заўважаецца недахоп індывідуалізацыі персанажаў.

Мастак Габер — сур'ёзны, удумлівы і арыгінальны па свайму каларыту. Яму варожы танныя эфекты. Асабліва ўлюбёнымі з'яўляюцца ў яго жоўтая і карычневая гамы. На выстаўцы ў Мінску ён прадстаўлен двума добра выкананымі работамі «Пейзаж» і «Слясарны цэх», дзе паказан стаханавец, моцны, валявы.

Тонкім эстэтычным густам уладае мастак тав. Ляндау (рысунак «Дрэва»). Вельмі добры яе рысункі «Сялянка з куўшынам». Ляндау праявіла сябе і як мастак-дэкаратар. На юбілейнай выстаўцы знаходзіцца яе пейзаж — карандашны рысунак — два прыгожа выкананых афорты «Калгасніца» і «Стаханавец».

Многа дынамікі ў накідзе тав. **Касцялкоўскага «Схватка».** Коннікі — напружанне мускулаў, блеск мечаў, свет і цень—усё гэта захватвае гледача.

Выяўляе здольнасці графік-карыкатурыст тав. Тэнавіцкі.

Трэба ўспомніць яшчэ здольнага Г. Гольдберга, адначасова пісьменніка і графіка-ілюстратара.

Да адной з лепшых жывапісных работ выстаўкі трэба аднесці пейзаж тав. Станіславы Цэнтнершвер, мастака высокай культуры. Яна жывапісец—і ў сваёй карціне здолела спалучыць любоў да колеру і формы з рэалістычнай перадачай пейзажа.

Рэалізм Цэнтнершвер апаэтызаван унутраным гучаннем. Любоў да каларыта мастак праяўляе і ў сваіх акварэлях. Ярка і жывапісна выкананы знаходзячыяся на выстаўцы ў Маскве яе палотны «Рынак» і «Сасновая вуліца» (масла).

Незвычайным талантам жывапісца і скульптара валодае тав. Г. Розенман. Яе творчасць прыцягвае да сябе натуральнасцю, прастатой і скромнасцю. Яе фарбы спакойныя, некрыклівыя. Яна любіць ізабражаць моманты адпачынку пасля напружанай працы. Вельмі добра яе «Лошадка у повозки», яе натурморты.

Яе кераміка «Селянін частуе яблыкамі чырвонаармейца» дае яркае разуменне аб магчымасцях мастака як скульптара. З апошніх яе работ на Мінскую выстаўку прынята акварэль «Дзеці». Выкананы ёю па дагавору партрэт стаханаўца прыцягвае ўмелай перадачай энергічнага, валявога твару — яго свядомасці і мэтанакіраванасці.

Здольныя таварышы Эфроім і Менашэ Зайдэнбойтэлі. На выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР», а таксама ў Маскве яны прадстаўлены 4 палотнамі—«У калгасным агародзе», «Гутарка з чырвонаармейцам», «Агарод» і «Пейзаж над Нёманам у Гродне».

Тав. Разанецкі многа піша і многа працуе. Жыццерадасны па натуры, улюбёны ў жывыя, яркія фарбы, ён апяваў смутак, вецер, які рве адзенне адзінокага падарожніка, нахіляе галінкі адзінокага дрэўца, старыя закінутыя завулкі яўрэйскага гетто, з крывымі расхістанымі домікамі. Цяпер яго тэматыка змянілася, стала жыццерадаснай. На выстаўцы ў Мінску знаходзіцца яго рысунак «Беспрацоўныя».

Бернард Ральніцкі чэрпаў сваё натхненне ў атмасферы яўрэйскага гетто. З вялікім талентам і ўдумлівасцю ён ізабражаў народныя тыпы. Прыемна, што мастак шчыра і жыва рэагіраваў на новыя падзеі, стварыўшы цікавую кампазіцыю «Уезд Чырвонай Арміі ў Беласток».

Тав. Марголін прадстаўлен на юбілейнай выстаўцы 2 палотнамі—«Парнікі» і «Совецкая вуліца» (масла).

Тав. Меер Берман—добры партрэтыст. З апошніх работ для Мінскай выстаўкі ў яго ўзят «Піонер з блакнотам». У натурморце, ва «Усходніх матывах», у «Танцаўшчыцы» таленавіты А. Берман перадае лёгкасць рухаў, адчувальнасць. На выстаўцы ў Мінску маецца яго натурморт—«Дзверы» і «Партрэт з кветкамі» (масла).

У мастака тав. Берэнцвейг асабліва добры пейзаж з дрэва—ён лірычны, эмацыянальны. На рэспубліканскай выстаўцы ў Маскве ёсць яе «Пейзаж» (масла).

Мастак тав. Гельман прадстаўлена поўным настрою пейзажам (масла).

У акварэлях тав. Манцэвіча — прастата, як і ў яго вясковым пейзажы. Вёска—яго стыхія.

Тав. Капланскі—здольны малады мастак з вялікімі магчымасцямі. У яго акварэлях — цеплыня, святло, празрыстасць. На выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» знаходзіцца яго «Склад лесу на Нёмане», выкананы тушшу.

З скульптараў вядучае месца займае таленавіты тав. Натан Рапапорт. Уся кампазіцыя ў цэлым захватвае гледача сваёй гарманічнасцю, сваім рытмам у нарастанні. Трагізм мінулага, радасныя адчуванні, завершаныя заключным акордам шчасця ў вядучай групе пярэдняга плана: жанчына з дзіцём—змораная, з упаўшымі шчокамі, вострымі сківіцамі, але радасць вызвалення ў яе на твары, у развіваючыхся як сцягі адзеннях, ва ўсёй яе істоце. Усё тут жыве і дыхае рэальнай праўдай сапраўднага жыцця і пачуццяў.

Месца такому помніку—сярод зелені і кветак беластоцкіх алей.

Тав. Месер, таленавіты скульптар, працаваў і працуе над статуяй таварыша Сталіна. Вельмі цікава яго «Сялянка».

У скульптуры тав. Хвіра асабліва цікава група дзяцей. Працуючы над сабой глыбей, Хвір можа праявіць сябе багацей і ярчэй.

Цікава група Пацаноўскага «Беспрацоўныя». Скульптару ўдалося перадаць момант дэпрэсіі не толькі ў агульным настроі фігур, але і ў бязвольна павісшых руках цэнтральнага персанажа.

У эмацыянальнай кампазіцыі тав. Кшыштоф'яка многа сардэчнасці. Селянін прыцягнуў да сябе руку байца. У гэтым руху адчуваецца падзяка, любоў і давер'е.

На выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» беластоцкія скульптары прадстаўлены трыма работамі: «Бюст Сталіна»—тав. Месера, «Бюст Варашылава» — тав. Смурло і «Дзіцячая галоўка»—тав. Ляуфера.

Многія з памянёных вышэй мастакоў—гэта ўжо мастакі закончаныя, з выражанай індывідуальнасцю, але якім аднак прадстаіць вялікая работа па асваенню совецкай соцыялістычнай культуры і, зжываючы астаткі фармалістычных тэндэнцый, смела ісці па шляху рэалізма. Другой-жа групе таленавітай моладзі (тт. Розенберг, Скурнік і інш.) трэба аблягчыць магчымасць далейшага развіцця і адукацыі па спецыяльнасці.

Мастакі ў сучасны момант аб'яднаны ў саюз мастакоў, дзе яны акружаны цёплай атмасферай. Адкрыта мастацкае вучылішча ў Беластоку, якое прыцягне ўсё маладое і здольнае, і ў недалёкім будучым стане цэнтрам мастацкай культуры. Адкрываецца музей. Такім чынам ствараецца атмасфера, у якой таленты будуць расці, паглыбляючы сваю творчасць.

С. Эльтэрман.

У апошнюю гадзіну

ПРЫЁМ РЭЙХСКАНЦЛЕРАМ ГЕРМАНІ п. ГІТЛЕРАМ ПОЛПРЭДА СССР У ГЕРМАНІІ тав. В. Г. ДЭКАНОЗАВА

БЕРЛІН, 19 снежня. (ТАСС). 19 снежня ў новай імперскай канцылярыі рэйхсканцлер Германіі п. Гітлер у прысутнасці міністра замежных спраў Германіі п. фон Рыбентропа прыняў паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Германіі тав. В. Г. Дэканозава, уручыўшага свае вярыцельныя граматы. Тав. В. Г. Дэканозаў прадставіў п. Гітлеру адказных супрацоўнікаў поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Германіі. Атрад асабістай аховы п. Гітлера аказаў тав. В. Г. Дэканозаву воінскія пашаны як пры яго прыбыцці, так і пры ад'ездзе.

—о—

РУЦІ ВЫБРАН ПРЭЗІДЭНТАМ ФІНЛЯНДСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

ХЕЛЬСІНКІ, 19 снежня. (ТАСС). Фінляндскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што прэзідэнтам Фінляндскай рэспублікі выбран цяперашні прэм'ер-міністр Руці.

—о—

ВЫСТУПЛЕННЕ ІДЭНА

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што сёння ў Лондане выступіў англійскі ваенны міністр Антоні Ідэн. Ідэн заявіў, што да 16 снежня страты англійскіх войск, якія ўдзельнічалі ў баях у Заходняй пустыні. лічыліся ў адну тысячу чалавек забітымі, раненымі і прапаўшымі без вестак. Па папярэдніх падліках колькасць захопленых у палон італьянцаў складае каля 30 тысяч чалавек. Гэтыя дасягненні, сказаў Ідэн, з'яўляюцца вынікам працяглай падрыхтоўкі арміі. Ідэн адзначыў, што без арміі не можа быць дасягнута перамога, і ўказаў на неабходнасць даць арміі ўзбраенне і неабходную падрыхтоўку.

—о—

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН. 19 снежня. (ТАСС). Англійскае міністэрства авіяцыі 19 снежня апублікавала наступнае камюніке: «У ноч на 19 снежня самалёты англійскай авіяцыі зноў бамбардыравалі Мангейм. Узнікла чатыры буйных пажары. Другое злучэнне англійскіх самалётаў бамбардыравала завод у Мілане, докі ў Генуі і адзін аэрадром ў Паўночнай Італіі. Было адзначана, што ў Мілане ўспыхнуў вялікі пажар».

—о—

ІНТЭРНІРАВАННЕ Ў АФРЫКАНСКІХ КАЛОНІЯХ УРАДА ВІШЫ

БОРДО, 19 снежня. (ТАСС). Міністэрства калоній урада Вішы атрымала звесткі аб тым, што некалькі сот прыхільнікаў урада Петэна з асяроддзя ваенных, каланіяльнай адміністрацыі, плантатараў і духавенства калоній Габон, Камерун і Французскага Конго інтэрніраваны прыхільнікамі дэ Голя. Вышэйшыя ваенныя і каланіяльныя чыноўнікі інтэрніраваны на караблях, якія стаялі на якары па рацэ Конга і ў портах на Атлантычным акіяне.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора не было зусім ні аднаго налёту на Англію. Увечары англійскія знішчальнікі збілі адзін германскі бамбардыроўшчык непадалёку ад Дуўра.

Ноч на 19 снежня прайшла без аб'яўлення паветранай трывогі. Германскія самалёты другую ноч зраду не паяўляліся над Англіяй. У кампетэнтных кругах мяркуюць, што гэта тлумачыцца неспрыяючымі метэаралагічнымі ўмовамі на кантыненце.

Англійская авіяцыя, не гледзячы на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, у ноч на 19 снежня бамбардыравала Мілан і Мангейм.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

АФІНЫ, 19 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора грэкі зрабілі паспяховыя аперацыі мясцовага характару на розных пунктах фронта. Узята многа палонных, а таксама захоплена вялікая колькасць ваеннай маёмасці.

НЬЮ-ЙОРК, 19 снежня. (ТАСС). Як паведамляе амерыканскі друк, у Афінах афіцыяльна аб'яўлена, што ў раёне Клісуры і Тэпелене працягваюцца жорсткія баі. Горад Клісуры знаходзіцца пад артылерыйскім абстрэлам. Прасоўваючыяся да Клісуры грэчаскія войскі сустрэлі супраціўленне італьянскага батальёна берсальераў. У прыбярэжным сектары новапрыбыўшыя італьянскія падмацаванні абараняюць порт Хімара.

Па апошніх звестках, італьянскія адборныя войскі прадпрынялі контратаку ў раёне Палермо, дзе захапілі важныя пазіцыі грэкаў. Аднак, грэкі прадпрынялі новае наступленне і пасля цяжкага бою зноў занялі свае папярэднія пазіцыі. Італьянцы панеслі вялікія страты.

На паўночна-усходнім фронце грэкі пераправіліся пад прыкрыццём артылерыйскага агню праз раку Таморыцу і дасягнулі схілаў горнага хрыбта Тамор.

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, учора раніцой грэчаскія часці зноў пайшлі ў наступленне супроць італьянскіх пазіцый на захад ад вёскі Трэсова, якая прыкрывае шлях да Эльбасана. Наступленню папярэднічала моцная артылерыйская падрыхтоўка. Італьянскі перадавы полк быў захоплен знянацку.

Заява Рузвельта

ВАШЫНГТОН. 18 снежня. (ТАСС). Рузвельт заявіў прадстаўнікам друку, што ён у цяперашні час разглядае праграму здачы ў арэнду Англіі амерыканскіх гандлёвых суднаў, самалётаў і іншых відаў узбраення з тым, каб Англія пасля вайны вярнула іх або пакрыла іх коштоўнасць. Урад ЗША, заявіў Рузвельт, магчыма, перавядзе на сябе англійскія ваенныя заказы ў Злучаных Штатах і перадасць гэтыя ўзбраенні ў карыстанне Англіі на ўмовах арэнды. Рузвельт указаў. што ён намеран прадставіць гэты або аналагічны план на разгляд сесіі кангрэса, якая адкрыецца 3 студзеня. У цяперашні час вывучаюцца падрабязнасці гэтага плана, які патрабуе прыняцця новага законадаўства і асігнаванняў з боку кангрэса (парламента).

Адказваючы на пытанне адносна юрыдычнага боку здачы Англіі ўзбраенняў у арэнду або прадастаўлення іх у пазыку, Рузвельт папярэдзіў супроць дыскусій фармальна-юрыдычнага парадку. Адказваючы на пытанні адносна дэталей гэтай праграмы, Рузвельт заявіў, што пытанне аб тым, хто будзе юрыдычным уладальнікам узбраенняў, зданых у арэнду або перададных узаемным парадкам Англіі, не мае істотнага значэння. Зараз важна забяспечыць Англію ваеннымі матэрыяламі і атрымаць гарантыі пакрыцця іх коштоўнасці пасля вайны. Падаўляючая большасць амерыканцаў несумненна лічыць, указаў далей Рузвельт, што супраціўленне Англіі з'яўляецца найлепшай і непасрэднай абаронай ЗША. Таму нават эгаістычныя інтарэсы ЗША патрабуюць аказання максімальнай дапамогі абароне Англіі. Вытворчасць ваенных матэрыялаў для абароны Англіі павялічвае вытворчую магутнасць ваеннай прамысловасці ЗША.

Карэспандэнты запыталі Рузвельта, ці павялічвае гэты план небяспеку ўцягнення ЗША ў вайну. Рузвельт адказаў адмоўна, заявіўшы, што ЗША ўжо прыкладаюць максімум намаганняў для снабжэння Англіі ваеннымі матэрыяламі і таму новая праграма будзе толькі працягам той-жа палітыкі, але ў другой форме. Адказваючы на пытанне, ці прадугледжвае гэта праграма перадачу Англіі ў арэнду ваенных караблёў, Рузвельт заявіў, што яна адносіцца толькі да гандлёвых суднаў. Рузвельт дабавіў, што па яго думцы новы план адхіліць неабходнасць перагляду закона аб нейтралітэце і закона Джонсона. Ён заявіў, што ЗША маглі-б нават пайсці на тое, каб прадаставіць Англіі наяўныя грошы ў якасці падарунка, але невядома, ці неабходны такія падарункі і ці жадае іх Англія. Рузвельт заявіў таксама, што ён разглядае гэту новую праграму на працягу апошніх 3—4 тыдняў.

Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, Рузвельт заявіў таксама, што, па яго думцы, Англія здольна аплаціць ужо заказаныя ваенныя матэрыялы і таму новая праграма будзе прымяняцца толькі ў адносінах будучых заказаў. Адказваючы на пытанне, ці будуць амерыканскія параходы перавазіць ваенныя матэрыялы ў Англію, Рузвельт заявіў, што ў гэтым няма неабходнасці. Ваенныя матэрыялы могуць дастаўляцца ў Англію нават на суднах пад балівійскім сцягам (як вядома, Балівія зусім не мае выхаду к мору).



Фізкультурныя заняткі у 7-ым класе 14-й сярэдняй школы ў Беластоку. Настаўнік тав. Рутэнберг З. С.

На здымку: вучаніца Ліна Каваленка робіць скачок.

Фота А. Сіпра

Літаратурны вечар, прысвечаны Янку Купале

Сёння, у 8 гадзін вечара, у зале педінстытута (Чырвонаармейская, 63) Беластоцкае аддзяленне Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР наладжвае вялікі ўрачысты літаратурны вечар, прысвечаны 35-годдзю літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР ордананосца Янкі Купалы.

Вечар адкрые ўступным словам паэт Максім Танк. З дакладам аб творчасці Янкі Купалы выступіць паэт Філіп Пестрак. Пасля даклада выступяць беларускія, польскія і яўрэйскія пісьменнікі і паэты. Студэнты педінстытута выступяць з мастацкім чытаннем твораў Янкі Купалы.

Вечар закончыцца выступленнем ансамбля песні і пляскі Беластоцкай дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам Р. Шырмы і мастацкай самадзейнасцю студэнтаў педінстытута.

На выстаўцы, прысвечанай Адаму Міцкевічу

Больш 700 чалавек пабывала ў Беластоцкай абласной бібліятэцы імені Горкага на выстаўцы, прысвечанай 85-годдзю з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча.

Многа наведвальнікаў запісалі свае ўражанні ў кнізе водгукаў.

— На выстаўцы шмат матэрыялаў, якія адносяцца да розных перыядаў жыцця паэта, — піша тав. Фрэнкель. — Гэтыя матэрыялы кідаюць новае святло на Міцкевіча, якога буржуазная крытыка імкнулася паказаць у фальшывым выглядзе. Таму яна прамаўчала яго супрацоўніцтва з дзекабрыстамі і яго публіцыстычную дзейнасць у Парыжы.

— Выстаўка паказала нам новага Міцкевіча, якога мы раней не ведалі. Гэтым самым яна дасягнула сваёй мэты, — піша тав. Васер.

З правільнай прапановай стварыць пастаянны аддзел твораў Міцкевіча ў бібліятэцы выступіў наведвальнік тав. Оскола.

Сярод водгукаў ёсць і крытычныя заўвагі. Тав. Лоцкі падкрэслівае, што выстаўка недастаткова адлюстравала сувязь Міцкевіча з рэвалюцыйна-дэмакратычным рухам. Рад наведвальнікаў звярнуў увагу на адсутнасць на выстаўцы скульптуры паэта.

Аб цікавасці да жыцця і творчасці паэта сведчыць тое, што многія наведвальнікі па некалькі разоў бывалі на выстаўцы.

ЁЛАЧНЫЯ ЎПРЫГОЖАННІ

На поўмільёна рублёў прыбыло ёлачных упрыгожанняў у магазіны Беластоцкага горпромгандлю. Акрамя таго на 100 тысяч рублёў атрымаў ёлачных упрыгожанняў Беластоцкі універмаг. Штодзённы абарот універмага за ўпрыгожанні складае 2.500—3.000 рублёў.

САМААДДАНЫ ЎЧЫНАК

Днямі на цэментным заводзе ў Росі ў топцы кацельнага аддзялення згарэлі каласнікі. Каб зрабіць рамонт, неабходна было спыніць увесь завод. Ноччу тэрмінова быў выклікан начальнік кацельнага цэха тав. Петрушкевіч. Аглядзеўшы топку, ён рашыў без астаноўкі завода правесці рамонт.

Не гледзячы на высокую тэмпературу і наяўнасць газаў у топцы, Петрушкевіч спусціўся ў топку і з дапамогай дзяжурнага слёсара Тапцэвіча, які рэгуліраваў падачу свежага паветра, на працягу трох гадзін зрабіў неабходны рамонт.

За самаадданы ўчынак дырэкцыя завода прэміравала тав. Петрушкевіча месячным акладам зарплаты, а тав. Тапцэвіча — трохтыднёвым заработкам.

ЗВОДКА

Аб ходзе выканання плана IV квартала 1940 года лесазагатовак і вывазкі па Беластоцкай вобласці па трэсту «Беластоклеспром» на 15 снежня 1940 года.

№№ па парадку	Назва раёнаў	Проц. выканання да квартальнага плана: Загатоўка	Вывазка
1.	Парэцкі	92,0	27,3
2.	Скідэльскі	64,7	23,5
3.	Гродненскі	47,3	18,8
4.	Саколкаўскі	44,0	27,9
5.	Крынкаўскі	34,2	50,3
6.	Заблудаўскі	29,2	13,8
7.	Аўгустоўскі	26,5	11,6
8.	Беластоцкі	25,9	40,1
9.	Валкавыскі	23,1	39,3
10.	Свіслацкі	19,0	42,0
11.	Дамброўскі	14,5	13,0
12.	Кнышынскі	6,0	20,0
13.	Сапоцкінскі	0,5	0,8
14.	Бельскі	0,2	0,5
	Усяго . .	26,5	20,4

—о—

Поспехі калгаса

Калгас імені Варашылава, Бельскага раёна, з вялікімі поспехамі сустракае новы 1941 год. Усе сельскагаспадарчыя работы ў калгасе былі праведзены своечасова. У тэрмін выкананы абавязацельствы перад дзяржавай. Чэснай, дружнай працай калгаснікі дабіліся вялікіх поспехаў у першы год свайго калектыўнага жыцця.

Калгаснікі дабіліся высокага ўраджаю. На кожны працадзень яны атрымаюць многа сельскагаспадарчых прадуктаў. Сям'я Андрэя Дамброўскага выпрацавала 488 працадзён, Сцяпана Коршака—464 працадні. На кожны працадзень калгаснікі атрымалі авансам 22 кілограмы бульбы. Пры канчатковым размеркаванні калгаснікі атрымаюць на працадзень па 4 кілограмы зярна.

В. Кірылюк.

—о—

Трэніровачны паход

ГРОДНА. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** Днямі вучні 9-й сярэдняй школы правялі трэніровачны паход. У 4 гадзіны ўсе ўдзельнікі паходу былі на мясцах. Перад імі была пастаўлена задача: дайсці да Скідэльскага шасе і перамагчы на шляху заражоную мясцовасць працягласцю ў 1 кілометр, якую яны прайшлі ў процівагазах, абыйсці горад ў напрамку кафельна-плітачнага камбіната і звярнуцца назад.

Заданне было выканана на «выдатна». Асабліва добра справіліся з сваімі задачамі каманды, якімі кіравалі вучні-камсамольцы Расіянскі і Гольдберг.

Паход прайшоў цікава і захапляюча. Вучні засталіся ім задаволены. У бліжэйшыя дні мяркуюць правесці другі, больш складаны паход.

Г. Лупсякоў.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара — 17-62, адказнага сакратара — 49, аддзелаў прапаганды і партыйнага — 16-10, эканамічнага аддзела — праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя — 14-32.

УБ—134. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруку